**Н.С.Старжынская**

# ПАДКАЖЫ СЛОЎЦА

**Вучэбны дапаможнік для дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Мінск 2003**

## Шаноўныя педагогі дашкольных устаноў
## і бацькі будучых школьнікаў

Вучэбны дапаможнік “Падкажы слоўца” – частка камплекта вучэбных дапаможнікаў для дзяцей 6-га года жыцця “Хачу вучыцца!”, куды таксама ўваходзяць рабочыя сшыткі “Сам сабе мастак”, “Незвычайнае знаёмства”, “Маленькі эколаг”, “Нас абкружае прастора, час, лік”, “Хачу быць здаровым”.

Кніжка, якую вы зараз трымаеце ў руках, змяшчае цікавыя пазнавальныя і развіццёвыя гульнявыя заданні для падрыхтоўкі пяцігадовых дзяцей да школы ў адпаведнасці з дзяржаўным адукацыйным стандартам у галіне “Навучанне грамаце”, а таксама для развіцця ў дашкольнікаў мыслення, маўлення, увагі, памяці і ўяўленняў.

*Што такое стандарт*
*і для чаго ён неабходны?*

Кожнае дзіця прыходзіць у школу са сваім багажом ведаў. У класе ж усе дзеці пачынаюць займацца па адзінай праграме. Змест кожнага дапаможніка камплекта “Хачу вучыцца”падабраны такім чынам, каб даць дашкольнікам роўныя стартавыя ўмовы і аблегчыць пачатак школьнага навучання. Гэта асабліва важна для тых дзяцей, якія не наведвалі дзіцячы сад. Стандарт – гэта не праграма, а той мінімум, які неабходны будучаму школьніку. Любая праграма дашкольнай адукацыі для дзіцячага сада значна шырэй стандарта, але абавязкова ўключае яго.

*Якія веды ўключаны ў стандарт?*

Да паступлення ў школу, у адпаведнасці з адукацыйным стандартам” у галіне “Навучанне грамаце”, дзіця можа навучыцца:
правільна вымаўляць усе гукі роднай мовы;
рэгуляваць гучнасць, тэмбр, інтанацыйны малюнак маўлення;
ужываць абагульняльныя словы, сінонімы, антонімы;
правільна змяняць словы па формах, спалучаць ў маўленні назоўнікі, прыметнікі, дзеясловы і інш.; валодаць некаторымі спосабамі словаўтварэння;
выкарыстоўваць у маўленні простыя і складаныя сказы;
праводзіць гукавы аналіз слова.

*Як працаваць з дапаможнікам у дзіцячым садзе?*

Вучэбны дапаможнік уключае 22 заняткі, якія дапамогуць педагогу вырашыць задачы фарміравання ў дзіцяці норм роднага маўлення, развіцця культуры зносін, выхавання норм і правілаў маўленчага этыкету. Дапаможнік “Падкажы слоўца” служыць для ўдакладнення, пашырэння, замацавання і дыягностыкі ведаў, якія маюцца ў дзяцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На занятках у дашкольнай установе гульнявыя заданні могуць быць выкарыстаны для арганізацыі кароткачасовай індывідуальнай, групавой і франтальнай работы (3-5 хвілін). Педагог можа выкарыстоўваць матэрыялы дапаможніка ў якасці дыдактычных гульняў у другую палову дня ў дзіцячым садзе, дапаўняючы іх іншымі гульнямі і вуснымі заданнямі, а таксама рэкамендаваць іх бацькам выхаванцаў.

*Як вучыць маленькага дзіця дома?*

Пяцігадовае дзіця – яшчэ не школьнік. Пакуль галоўнае у яго жыцці – гульня, праз якую яно пазнае навакольны свет. Дарослыя, якія любяць свайго малога, заўсёды змогуць зрабіць так, каб на гульнявых занятках яно не стамлялася і не сумавала. Пастарайцеся падрыхтаваць усе неабходнае (алоўкі, фарбы і інш.) загадзя. Пазбягайце пераўтварэння гульні ў школьны ўрок: як толькі заўважыце, што дзіця стамілася, неадкладна спыняйце гульню. Рабіце ўсё добразычліва, хваліце свайго будучага школьніка не толькі за вынік, але і за старанне.

Ваша дзіця адчувае сябе радасна і ўпэўнена, з цікавасцю і нецярпеннем чакае заняткаў? Вы на правільным шляху!

*Ці трэба бацькам дапамагаць дзіцяці*
*ў выкананні заданняў?*

Работа з дапаможнікамі вымагае актыўнага ўдзелу дарослых, нягледзячы на тое, што гульнявыя заданні разлічаны на самастойнае выкананне дзіцем. Бацькі чытаюць малому змест заданняў, гутараць з ім. Для будучага школьніка вельмі важна пастаянна адчуваць зацікаўленасць і падтрымку ў яго занятках з боку мам, тат, бабуль і дзядуль!

**Поспехаў вам у выхаванні будучага школьніка!**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паважаныя бацькі і педагогі!

Прапануем вашай увазе дапаможнік па развіцці маўлення дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту. Дапаможнік уключае 22 заняткі, кожнае з якіх прадугледжвае нескалькі заданняў.

Перш за ўсё, у заняткі ўключаны заданні на развіццё правільнага гукавымаўлення, дыферэнцыяцыю блізкіх па сваіх характарыстыках гукаў. Заданні пабудаваны такім чынам, што дарослы чытае чыстагаворку, а дзіця дагаворвае пропушчанае слова, арыентуючыся на малюнак і рыфму, затым прагаворвае чыстагаворку поўнасцю з рознай гучнасцю (шэптам, ціха, звычайным тонам, гучна), рознай хуткасцю (павольна, у нармальным тэмпе, хутка). Цесна звязаны з гэтымі заданнямі практыкаванні, арыентаваныя на азнаямленне дзяцей з гучаннем слова, дзяленнем яго на склады.

Затым дзецям прапануюцца слоўнікавыя і граматычныя заданні, накіраваныя на пашырэнне і ўдакладненне слоўнікавага запасу дзіцяці, фарміраванне граматычнага ладу маўлення. Гэта заданні на называнне прадметаў і іх абагульненне, адрозненне многазначных слоў, падбор антонімаў, утварэнне новых слоў (напрыклад, прыметнікаў ад назоўнікаў, складаных слоў), змяненне слоў па формах і інш.

Нарэшце, у занятках прадугледжаны заданні на развіццё навыкаў звязнага маўлення дзіцяці. Гэта складанне расказаў па карцінках, творчых расказаў, а таксама тлумачэнне значэнняў прыказак і прымавак. Для лепшага разумення дзецьмі апошніх мэтазгодна ілюстраваць іх нагляднымі прыкладамі з жыцця.

Дапаможнік прызначаны для сумеснай работы дарослага і дзіцяці. Заданні кожных заняткаў неабавязкова выконваць за адзін раз. У той жа час занятк па сшытку можна дапоўніць іншымі гульнямі і вуснымі заданнямі. Галоўнае, занятк не павінны стамляць дзяцей і надакучваць ім. Не забывайце пахваліць дзіця за старанне.

Жадаем поспехаў Вам і Вашаму будучаму школьніку.

Дарагі сябар!

У гэтым сшытку табе прапануюцца розныя заданні, выканаўшы якія ты навучышся разборліва, выразна вымаўляць гукі і словы; даведаешся, што словы бываюць розныя, яны патрэбны, каб дакладна і прыгожа выразіць сваю думку. Ты навучышся расказваць пра тое, што намалявана на карцінках і пра тое, што ты сам прыдумаеш. Гэта дапаможа табе наладзіць адносіны з іншымі дзецьмі – усім жа хочацца пасябраваць з тым, хто ўмее цікава расказваць, а ў будучым дапаможа добра вучыцца ў школе.

Упэўнены, што ў цябя ўсё атрымаецца. Жадаем табе удачы!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Заняткі 1.**

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку

Д - Т

Да – та – та –

хвост пушысты ў (мал. кот).

Ту – ду – ду –

у лесе выразаў… (мал дудачка).

Сабака Том вартуе … (намалюй адгадку).

---

## Усё навокал мае назву

Назаві, якія цацкі ёсць у гульнёвым кутку.

Ты сказаў розныя словы.
Знайдзі і злучы лініямі цацкі з аднолькавымі назвамі.

| | |
|---|---|
| Мал. машына чырвоная пажарная | мал. рыбка звычайная |
| Мал. рыбка залатая (з каронай) | мал. качачка пластмасавая плыве |
| Мал. лялька галыш | мал. машына сіняя легкавая |
| Мал. качачка пушыстая стаіць | мал. лялька прыгожа апранутая |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Бачыш, адным словам можна назваць розныя прадметы.

Назаві цацкі ласкава: рыбка, рыбачка…

---

## Падкажы слоўца

Быў у хлопца самакат –
Памяняў на … (мал.цацачны, аўтамат)

Аўтамат жа - на цягач.
А цягач змяніў на …(*мяч*)
Намалюй адгадку

## Раскажы казку

Мал. да казкі «Як курачка пеўніка ратавала».

| | | |
|---|---|---|
| Пеўнік і курачкі. Пеўнік знайшоў бобінку. | | Пеўнік падавіўся бобінкай. Ляжыць, ногі задраў. Падбягае курачка. |

| | | |
|---|---|---|
| Стаіць карова. Курачка просіць у яе масла | | Касцы стаяць з косамі.. Курачка просіть сена. |

| | | |
|---|---|---|
| Пекар стаіць ля пліты. Курачка просіць пірагоў | | Курачка ў лесе. Нясе дровы. |

Што было далей?

## Чаму так гавораць?

| |
|---|
| У суседстве жыць - адзін аднаму служыць. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Занятак 2

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку
## П - Б

Па – ба – ба --

У Пеці ёсць (мал. труба)

Боб ды боб – два … (*бабы*).
А яшчэ боб – тры … (*бабы*).

Мал. Тры бабы́

Оп – оп -оп –

Пракоп палоў (мал. кроп)

---

## Адзін – многа

Назаві прадметы (*вуха – вушы, вока –вочы…*)

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Мал. вуха | Мал. вушы | | Мал. вока | Мал. вочы |
| | | | | |
| Мал.лоб | мал. ілбы (два дзіцяці сутыкнуліся ілбамі) | | Мал. рот | Мал. раты (дзве дзяўчынкі балбочуць) |
| | | | | |
| Мал. птушка | Мал. птушкі | | Мал. яйка | Мал. яйкі |
| | | | | |
| Мал. ліст | Мал. лісце | | Мал. пяро | Мал. пер'е |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Раскажы па малюнках

| | | |
|---|---|---|
| Мал. У вадзе плыве качка з качанятамі. На беразе курыца з куранятамі. Курыца глядзіць на качку. | Курыца звяртаеццца да качкі. Качка павярнулася да курыцы, адказвае ёй. | Курыца на спіне ў качкі, кожнае кураня на спіне ў качаняці пераплываюць вадаём. |

Прыдумай, куды сабралася курыца з куранятамі.
Прыдумай назву свайму расказу.

---

## Хто як крычіць?

Мал. на тэму «Вясковы двор»:

Мал. курыца мал. Певень на плоце

мал. у сажалцы гусь і качка

мал. каза мал. свіння

мал. авечка мал. карова

мал. конь

мал. сабака ў будцы.

Каля сабачай міскі - верабей. мал. кошка

Курыца крычыць *квох-квох*, яна *квохча*. Скажы, як «гаворацъ» астатнія жывёлы.

Назаві жывёл ласкава: курачка, пеўнік …

---

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Занятак 3

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку

**Г - Х**

Ха – га - га – хачу …
Хі – гі – гі – смачныя… (мал. пірагі)
Ху – гу – гу – з'есці не …(*магу*).

Ох – ох – ох, ох – ох – ох -
баба сеяла (мал.гарох).

**К**

Ку - ку, ку - ку –
зязюля на …(мал. Зязюля на суку).

---

## Назаві прафесію

Правядзі лініі ад людзей да месца іх працы. Назаві іх прафесіі.

Раскажы, хто чым займаецца.

Мал. Будынак з трыма характэрнымі вітрынамі: 1) на шыльдзе намаляваны лыжка і відэлец; у акне відаць людзей, якія сядзяць за сталом, яны ядуць; 2) на шыльдзе намаляваны расчоска; у акне відаць цырульнікаі яго кліента, якога стрыгуць; 3) на шыльдзе намаляваны чырвоны крыж, з дзвярэй выходзіць чалавек з рукой на перавязі.

Перад будынкам стаяць: цырульнік (жанчына ў ружовым халаціку з расчоскай у руцэ), урач у белым халаце і шапачцы з фанендаскопам; кухар у высокім белым каўпаку, белай куртачцы з апалонікам у руцэ.

---

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## У слова можа быць многа значэнняў

**Адгадай загадкі:**

Пад хвоямі, пад смолкімі
Па лясных дарожках
Бяжыць клубок з іголкамі
На кароткіх ножках

Мал. елка

пад елкай

вожык

Заўсёды летам і зімой
Мае іголачкі са мной.
Галінак у мяне багата.
Я сустракаю з вамі свята.

**Якія гэта іголкі?**

Мал. іголка швейная мал.. іголка сасновая мал. іголка медыцынская (на шпрыцы)

**Пра якую іголку загадка? Абвядзі адгадку кружком.**

Сівенькая, маленькая, а ўвесь свет абшывае.

---

Чым падобныя ўсе іголкі?

**Загадай загадку**
Прыдумай кароткі расказ пра іголку, якая яна, што з ёю можна рабіць.

А мы адгадаем, пра якую іголку ты расказаў.

---

## Гэта хто такі калючы?

Пунктірны малюнак вожыка.

Абвядзі перарывістыя лініі. Дамалюй побач, што хочаш. Раскажы, хто гэта і што з ім аднойчы адбылося.

---

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Занятак 4

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку
## Ф - В

Фу – ву – ву --

У лесе бачылі … (мал. сава)

А́фа – а́фа- а́фа –

у Афрыцы (мал. жырафа)

Сеў у жыта матылёк на блакітны … (мал. васілёк чорна-белы, значок «расфарбуй»)

**Скажы хутка**

Фарсун фарсіў у фіялетавым фраку

І фетравым капелюшы. (чорна-белы мал. на тэму, значок «расфарбуй»)

## Адзін – многа

Назаві малюнкі (а*дзін камар – многа камароў, одна муха – многа …).*

Мал. камар мал. камары мал. муха мал. мухі мал. пчала мал. пчолы

Мал. карова мал. каровы мал. авечка мал. авечкі мал.конь мал. коні

Мал. жаба мал. жабы мал. вуж мал. вужы мал.яшчарка мал. яшчаркі

Назаві намаляваных у першым і другім радзе адным словам (*насякомыя, жывёлы*)

А жаба, вуж і яшчарка называюцца земнаводнымі. Як ты думаеш, чаму?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як гучаць словы?

Вымаві назвы малюнкаў.

Знайдзі словы, якія гучаць падобна. Злучы іх лініямі.

Мал.майка мал. ёлка (навагодняя) мал. лыжка

Мал.мышка мал. чайка мал. іголка

Пераўтвары ўсе намаляваныя прадметы ў маленькія і назаві іх (*маленькія маечкі, маленькія чаечкі*…). А гэтыя пары слоў падобна гучаць?
Успомні іншыя словы, якія гучаць падобна.

## Што няправільна?

Мал. «У дзіцячым пакоі». Над ложкам вісіць карціна, на якой намаляваны аўтамабіль угару коламі; каля ложка тумбачка, на ёй настольная лямпа, на абажуры якой – гняздо з птушынымі яйкамі. На дыванчыку ля ложку цацачны паравозік з адным квадратным колам. Побач трохкалесны веласіпед, у якога адсутнічае адно задняе кола.

Абвядзі кружком і раскажы, што намалявана няправільна.

## Чаму так гавораць?

Усякай рэчы свае месца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Занятак 5

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку

**С**

Са – са – са – у лесе бегае …(мал. ліса)

Сі – сі – сі – у рацэ … (мал. карасі)

Су – су – су – убачылі …

Усь – усь – усь – плыве белая… (мал. гусь).

---

## Скажы наадварот

Падбяры словы, процілеглыя па сэнсе (*высокі – нізкі, чыстыя* - …)

Мал. жыраф мал. вожык

мал. чыстыя рукі брудныя рукі

Мал. пяро гіра

мал. марожанае (у вазачцы) кубак з чаем (ідзе пара)

Мал. лімон мал.цукерка

дрэва тоўстае дрэўца тонкае

Сукенка кароткая сукенка доўгая

Слон матылёк

---

## Чаму так гавораць?

| |
|---|
| Не хваліся пачаткам, а хваліся канчаткам. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Што і як можна адрамантаваць?

Мал. ваза с трэшчынамі — Адарваны гузік

Зламаны плот — Банан са знятай напалову скуркой

Разбітае яйка — зламаная машынка

Побач з кожным мал.- пусты квадрацік

Калі прадмет можна адрамантаваць, зафарбуй квадрацік сінім колерам, калі нельга –чырвоным.

Раскажы, чаму ты так думаеш.

---

**Намалюй што-небудзь, што ты можаш зрабіць сам.**

---

Мал. пустая рама для карціны

---

Раскажы пра гэта.

**Калі так гавораць?**

Справа майстра баіцца.

**А так?**

Не гавары, што рабіў, а гавары, што зрабіў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Занятак 6**

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку

**З**

За – за –за – рагатая …

Мал каза

Зе – зе – зе – дай вады …

У лапах балалайка -- (мал. цацачны зайка з бабалайкай)
То мой музыка - …

---

## З чаго зроблены цацкі?

**Паслухай верш:**

Гумавыя вусы,
Гумавыя вочкі,
Гумавыя вушкі,
Гумавыя шчочкі.

Гумавая шыйка,
Гумавая шорстка
Гумавыя лапкі
Тупаюць няжорстка.

Мал.цацкі: гумавая кошка, драўляная матрошка, металічная машынка, плюшавы мішка,

гліняны пеўнік, мяч, кубікі, папяровы самалецік

З чаго зроблена цацачная кошка?
А матрошка зроблена з дрэва. Значыць, яна…
Кубік зроблены з пластмасы. Ён … А калі кубік зроблены з кардону, ён …
Раскажы пра астатнія цацкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

**Чацвёрты лішні**

Паглядзі на малюнкі. Закрэслі той, што не падыходзіць. Растлумач, чаму ён лішні. Расфарбуй астатнія малюнкі

Мал. Цацачныя грузавік, легкавы аўтамабіль, самазвал, кацяня.

---

# У слова можа быць многа значэнняў

## Знайдзі на малюнках і абвядзі кружком усе ручкі

Мал. ручка для пісьма ручка дзіцяці кубак з ручкай дзверы з ручкай

Сумка з ручкай патэльня шафа з ручкай парасон

---

## Знайдзі на малюнках і абвядзі кружком усе ножкі

Мал. лялька грыб канапа стул стол

---

## Знайдзі на малюнках і абвядзі кружком усе шапкі і капелюшы

Мал. Капялюш на даме цвік грыб

---

# Адгадай і намалюй

Паміж гор сядзіць Ягор
Капелюшом накрыты.

Адной ручкай усіх сустракае,
Другой – дадому праводзіць.

---

Пад шапкаю, ды не грыб,
На ножцы, ды не расту.
З малатком спаткаюся,
У дошку ўміг схаваюся

Ногі ёсць, а не прайдуся,
Спінка ёсць, а не кладуся.
Сядзенне ёсць, а не саджуся.

---

Раскажы, як ты адгадаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Занятак 7**

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку С - З

За – са- са – заляцела ў дом …

(мал. аса)

Зы – сы- сы – мы спужаліся …

Са – за – за – прыляцела …

(мал. страказа)

Су – зу- зу – мы злавілі …

---

## Паслухай верш

Села кошка на парозе,
Пайшоў конік па дарозе,
А на лузе каля рэчкі
Кася пасвіла авечкі.

Мал. да верша

**Раскажы, хто дзе** (*кошка на парозе, рыбак на беразе…* )

Мал. рыбак на беразе

заяц скача па снезе

Мядзвезь спіць у бярлозе

Мал.хлопчык гуляе на падлозе

малюнкі ў кнізе

---

## Адгадай загадку

Мал чапля на адной назе

Стаіць у лазе
на адной назе.

значок “расфарбуй”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Адгадай

### Чый хвост?

Мал.: лісіны хвост выглядвае з нары; за дрэвам воўк, з аднаго боку дрэва бачна морда, с другога – хвост; заяц за пяньком, бачныя вушы, з-за пянька тырчыць хвосцік; у вялікае дупло напалову ўлез мядзведзь, бачны хвост; з-за куста бачны собачы хвост (абаранкам); з мышынай норкі тырчыць мышыны хвосцік; з дупла на дрэве - вавёрчын.

Назаві, чые хвасты віднеюцца (*лісіны, воўчы*…)

---

### У каго такія вялікія вушы?

Пункцірны малюнак слана.

Абвядзі перарывістыя лініі. Дамалюй побач, што хочаш. Раскажы, хто гэта, які ён  і што з ім аднойчы адбылося.

---

### Калі так гавораць?

| Робіць з мухі слана |
|---|

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Занятак 8**

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку

**Л**

Лу – лу – лу – натачыў (мал. піла)

Лі – лі – лі – кашу (мал. каша з парай над талеркай, над ёй рука соліць)

---

## Назаві прадметы (*залаты пярсцёнак*, *залатая* …)

мал.пярсцёнак мал. манета мал. завушніцы

Што яшчэ можа быць залатым?

---

## Адгадай загадкі і расфарбуй адгадкі

У залаты клубочак
схаваўся дубочак.

Мал.жолуд

мал. рамонкі

На лузе браткі
З аднае сямейкі:
Залатыя вочкі,
Белыя вейкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Чаму жолуд і “вочкі”рамонкаў называюцца залатымі?

## Паслухай верш

Мая мама добрая такая,
Мая мама проста залатая!

А ўжо так мяне матулька любіць!
Кожны раз і песціць, і галубіць.

Мал. на тэму

Чаму дзіця назвала сваю маму залатой?

---

## Пра каго так гавораць?

Майстар – залатыя рукі.

## Паслухай вершы

Ліска лашчыць лісяня,
А ласіха – ласяня.
Леў ласкава лапаю
Ільвяня паляпвае.

Утульная кватэра
У кенгураняці.
Такая дастаецца
Не кожнаму дзіцяці.

Тыгр, тыгрыца тыграня -
Найсапраўдная радня.

мал. да вершаў, дзе акрамя названых жывёл, намаляваны: ваўчыха з ваўчанём, зебра з зебранём, слон са сланянём, мядзведзь з медзведзянём. Далей: бегемот з дзіцянём, насарог з дзіцянём, жырафа з дзіцянём, малпа з малпянём.

Назаві ўсіх намаляваных жывёл і іх дзетак.
А хто дзіцяня ў малпы? У леапарда? У бегемота? У насарога? У жырафы?

---

## У каго такія вялікія вочы?

Пункцірны малюнак жабы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Абвядзі перарывістыя лініі. Дамалюй побач, што хочаш. Раскажы, хто гэта, якая яна і што з ёй аднойчы адбылося.

Занятак 9

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку

## Р - Л

Ры – ры – ры

– гудзелі … (мал. камары)

Ра – ла – ла – на кветцы…

мал. пчала

– Ры - лы- лы - не баюся …

У двары горка, пад горкай … (*норка*)

## Што не так?

**Вывучы верш напамяць і раскажы сябрам**

А мая кошка

Жыве ў гняздзе,

Лётае вакол,

Прыляцела ў двор,

Зазірнула на базар

Гучна крыкнула: “Кар! Кар!”

мал. на тэму верша

-------------------------------------------------------------------------------------------

## Усё навокал мае назву

**Назаві малюнкі**

мал. самалёт у палёце

мал. аўтамабіль на дарозе

мал. цеплаход у моры

мал. электрычка імчыць па рэйках

мал. станцыя метро, стаіць поезд

Як назваць усё гэта адным словам?

Злучы лініямі наземны транспарт. Чаму ён так называецца?

Да якога віду транспарта адносіцца самалёт? Цеплаход? Метро?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Раскажы, што адбылося

### На дзіцячай пляцоўцы

Тут пяць дзяцей, якія парушаюць правілы паводзін і гульні. Абазнач іх значком **X**.

Сюжэтны мал.: На дзіцячай пляцоўцы горка. Каля лесвічкі стаіць дзяўчынка. Хлопчык з'яджае з горкі задам наперад. На двух качэлях двое дзяцей. Адзін сядзіць, другі стаіць нагамі на сядзенні. Чарга да фантанчыка. Адзін хлопчык п'е ваду. Другі, распіхваючы ўсіх, лезе без чаргі. Побач на тратуары дзяўчынка з сілай штурхае хлопчыка ў спіну. Другая дзяўчынка бяжыць на праезджую частку за мячыкам. Едзе машына.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

Раскажы пра тое, што намалявана.

Хто з дзяцей і якія «ветлівыя словы» павінны сказаць? Якія яшчэ ты ведашеш «ветлівыя словы»? Калі мы іх гаворым?

---

## Чаму так гавораць?

| Ветлівае слова як вясновы дзень. |
|---|

Занятак 10

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку Ў

Еў – еў – еў – Вова кашу …( *з'еў*). Еў –еў –еў – храбры, дужы (мал.леў)

Іў – іў – іў – кошку … (*пакарміў*). Оў – оў – оў – гэта цар … (*звяроў*).

Пакуплялі спеўнікі маладыя … (*пеўнікі*). Мал. на тему

---

## Скажы наадварот

### Знайдзі і злучы лініямі процілегласці, назаві іх.

Мал. Шнуркі на красоўках завязаныя. Яйкі разбітыя (выкаціліся з кошыка)

Рука, сціснутая ў кулак. Сланечнік «адвярнуўся»

Яйкі цэлыя. Рука разжатая (раскрытая далонь).

Сланечнік павернуты «тварам» Пласцікавая бутэлька раплюшчаная

Пласцікавая бутэлька целая Шнуркі на красоўках развязаныя.

Кактус с вялікімі калючкамі У гамаку пуста

Хлопчык у гамаку кветка з пялёсткамі, адзін ападае

---

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Раскажы па малюнках

**Выраж малюнкі, разлажы іх па парадку**

**і раскажы, што адбылося.**

| | |
|---|---|
| прыклей | Мал.: брудны сабачка |
| прыклей | Мал.: чысты, радасны сабачка |
| прыклей | Мал.: сабачка рые зямлю |
| прыклей | Мал.:сабачка купаецца ў тазіку |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як ты думаеш, што было потым?

Прыдумай назву свайму расказу.

Занятак 11

## Як гучаць словы?

Вымаві назвы малюнкаў у кожнай рамцы. Назаві першыя гукі ў словах. Здагадайся, які малюнак ў рамцы лішні. Абвядзі яго кружком..

Мал. рыбка, леў, ліса, лебедзь

Мал. сонейка, зебра, слон, сабака

Мал. жырафа,  жолуд, шапка, жук

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Паслухай верш

**Гэта праўда або не?**

Сядзіць рыбка на страсе.
Спіць карова ў кажусе.
Воўк зубаты ў гаросе
Грызе моркву пакрысе.

Мал. да верша

Назаві, што ў гэтым вершы няправільна. Хто насамрэч спіць на страсе? Ходзіць у кажусе? Грызе моркву?

---

## Што няправільна?

Сюжэтны малюнак:

Лета. Бераг мора. Дзяўчынка будуе снежную бабу. Хлопчык едзе па пяску на ролікавых каньках. Другі хлопчык у вадзе ў рукавічках і шаліку на голым целе. У вадзе расце елка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

Абвядзі кружком і назаві, што намалявана няправільна. Чаму ты так думаеш?

---

## Чаму так гавораць?

| Ад спеху не нарабіць бы смеху. |
| --- |

Занятак 12

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку

**Ш**

Аш – аш – аш –

у лесе ёсць… (мал.шалаш)

Шу – шу – шу –

ліст … (*напішу*) мал. пішучая рука

Сашы далі кашы, а Машы - … (*сыраквашы*).

---

## Усё навокал мае назву

**Знайдзі і злучы лініямі малюнкі з аднолькавымі назвамі.**

Мал. уроскідку: кошык плецены і кошык баскетбольны, лісічкі-жывёлы і лісічкі-грыбы, каса дзявочая і каса-інструмент; ліст з дрэва і ліст-пісьмо, ключ дзвярны і скрыпічны ключ.

Бачыш, якія розныя прадметы называюцца аднолькавымі словамі.

---

## Чаму так гавораць?

| Слова як птушка: выпусціў - не вернеш. |
|---|

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Прыдумай мянушку

### Паслухай верш:

У старой і старога
Коцік быў, якіх многа:
Чарнавухі
І белашчокі,
Белапузы
І чарнабокі.

мал. да верша: коцік (чорна-белы), на мал. выдзелены шчокі, пуза і бок.

Сталі думаць стары і старая:
-- А мянушка ў ката - якая?
Мы любілі яго, гадавалі,
А дагэтуль ніяк не назвалі.

Расфарбуй коціка так, як пра яго гаворыцца ў вершы.
Прыдумай яму мянушку. Раскажы, які ён і што з ім аднойчы адбылося.

---

### Дзікая або свойская?

Назаві жывёл. Злучы іх лініямі з месцам іх жыхарства.

Мал. уроскідку: карова, воўк, сабака, кот, ліса, вожык, конь, лось, авечка, заяц, мядзведзь, свіння, каза, мышка.

мал.:хлеў, побач чалавек; мал. лес

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Занятак 13

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку

### Ж

Жа – жа –жа - злавілі… (мал. вуж)

Жы – жы – жы – ў вадзе плаваюць…(маржы)

Ляжыць вожык ля ёлкі, у вожыка… (*іголкі*).

---

## Скажы наадварот

**Назаві прадметы і іх процілегласці** (*свежы хлеб – чэрствы хлеб, свежая рыба – марожаная рыба…)*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Мал. свежы хлеб | Мал. свежая рыба | Мал. свежыя агуркі (на градцы) | Мал. свежая кашуля | Мал. свежыя кветкі |
| | | | | |
| Мал. лустачкі чэрствага хлеба | Мал. марожаная рыба (на вітрыне) | Мал. салёныя агуркі ў слоіку | Мал. брудная кашуля | Мал. Засохшыя кветкі |

Падкажы процілегласць.

Свежы вецер – … (цёплы *вецер*).
Свежая газета - … (*старая газета*).
Свежая галава - … (*стомленая галава*).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Што няправільна?

Сюжэтныы малюнак: Дарога. Па абочыне (траве) едзе машына. У машыне парася. Прама перад носам у яго паветраны шарык. Адно кола машыны квадратнае. У сярэдзіне другога кола намалявана мордачка: ☺ .Адна пярэдняя фара намалявана ў выглядзе вока, г.зн. з вейкамі.
На дарозе светлафор, у якім колеры зверху ўніз : зялёны, чырвоны, жоўты.

У адваротны бок па дарозе едзе веласіпедыст-зайка. Ён не трымаецца за руль. Ззаду тры колы, адно з якіх зроблена ў выглядзе мячыка.

За дарогай пейзаж. Устае сонца. Адначасова ў небе месяц.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Абвядзі кружком тое, што намалявана няправільна. Раскажы, як павінна быць.

---

## Адгадай загадку

Ён над вуліцай сядзіць,

Ён на вуліцу глядзіць.

Як зялёным заміргае -— мал. контур светлафора

Пераходзіць дазваляе,

Жоўты – знак перасцярогі,

Уцякай хутчэй з дарогі.

А чырвоны загарыцца –

Трэба тут жа прыпыніцца. Значок “расфарбуй”

Занятак 14

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку

## Ш - Ж

Прынясіце ліст паперы,
Што шырэй за нашы дзверы,
Што вышэй за нашу шафу, -            мал да верша
Намалюю вам … (*жырафу*)

---

## Знайдзі гук у слове

**Абвядзі кружком тыя малюнкі, у назвах якіх ёсць гук Ж.**

Мал. уроскідку: жук, кошка, вожык, жырафа, мышка, Чабурашка, журавіны

## Назаві ласкава

Скажыце пра ўсіх намаляваных ласкавыя словы (*жучок, жучышка, жучонак, жучоначак …*).

---

## Назаві прафесію

Правядзі лініі ад людзей да месца іх працы. Назаві іх прафесіі. Раскажы, хто чым займаецца.

Мал. Будынак з трыма характэрнымі вітрынамі: 1) аўтамайстэрня (на шыльдзе намалявана кола, у расчыненыя вароты відаць машына, якую рамантуюць; 2) музычная школа (на шыльдзе скрыпічны ключ, у акно відаць заняткі: хлопчык іграе на скрыпцы, педагог на фортэпьяна); 3) пажарная часць (у расчыненыя вароты відаць пажарныя машыны).

Музыкант са скрыпкай, пажарны ў касцы, слесар з гаечным ключом у руцэ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Раскажы па малюнках

Выраж малюнкі, разлажы іх па парадку

і раскажы пра тое, што тут адбылося

| | |
|---|---|
| прыклей | Мал. Кот вудзіць рыбу |
| прыклей | Мал. Кот ідзе на рыбалку |
| прыклей | Мал. Кот ідзе с рыбкай, вудачка на плячы |
| прыклей | Мал. Кот надзяе чарвяка на кручок |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як ты думаеш, што было потым?
Прыдумай назву свайму расказу.

---

## Адгадай загадку,
## Намалюй адгадку

Кіёк у руцэ, а нітка ў рацэ.

Занятак 15

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку

**С - Ш**

Са – ша –ша – Соня мые … (мал. малыш)

Ыс – ыш - ыш – кот злавіў … (мал. мыш)

---

## Што не так?

Кошка ў хаце мыш злавіла,
Напаіла, накарміла,
У куточку спаць паклала,
Каб да ранку спачывала. Мал. на тэму

---

**Злучы лініямі тыя малюнкі,**
**якія складаюць пару** (*шалік – шапка…*)
**Чаму ты так думаеш?**

мал. шышка мал. шакаладка

мал. шапка мал. сасна

мал. сушка мал. шалік

Расфарбуй тыя малюнкі, назвы якіх пачынаюцца з гука С.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Што было далей?

### Раскажы па малюнках. Прыдумай, што было потым.

| | |
|---|---|
| Мал. Хлопчык убачыў кветкі ў магазіне | Хлопчык купляе кветкі |
| **1** | **2** |
| Хлопчык звоніць у дзверы з букетам у руках | Дорыць кветкі маме |
| **3** | **4** |

Прыдумай назву свайму расказу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## З чаго складаюцца словы?

Намалюй пад кожнай карцінкай столькі кружкоў, колькі складоў у слове

| | | |
|---|---|---|
| Мал. ружа | мал. рамонак | мал. васілёк |
| Мал. астра | мал. півоня | мал. гваздзікі |

Як назваць усё гэта адным словам?

Якія букеты можна сабраць з гэтых кветак? (*Букет з руж, букет з …)*

Занятак 16

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку

## З – Ж

Воўк на лужайцы – задрыжалі … (*зайцы*) мал. на тэму

---

## Пытайцеся – адкажам

**Паслухай чыстагаворку**. Паўтары кожную частку спачатку ў выглядзе пытання, а потым – адказу (*Захварэў вусаты кот? – Захварэў вусаты кот.*)

Захварэў вусаты кот, у яго баліць жывот.

---

## Скажы наадварот

Подбяры словы, процілеглыя па сэнсе (*лянівы - працавіты, гучна* - …)

Мал. Ямеля на печцы Папялушка за працай

Мал. хлопчык-барабаншчык- дзяўчынка закалыхвае лялььку

Бабуля частуе піражком Баба – Яга

Дзіця ўпусціла марожанае, на вачах слёзы Дзіця есць марожанае, усміхаецца

Ідзе дождж. Дрэва. Пад дрэвам сухая дзяўчынка. Падбягае мокры хлопчык

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Раскажы па малюнках

**Выраж малюнкі, разлажы іх па парадку**

**і раскажы, што адбылося.**

| | |
|---|---|
| прыклей | Мал.: кот перакуліў вазу з кветкамі на стале |
| прыклей | Мал.: дзяўчынка пагражае коціку пальчыкам |
| прыклей | Мал.: дзяўчынка ставіць кветкі ў вазу |
| прыклей | Мал.: кот глядзіць на вазу з кветкамі |

Як ты думаеш, хто падарыў дзяўчынцы букет? А што было потым?
Прыдумай назву свайму расказу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Калі так гавораць?

Як кот шкадлівы, а як заяц баязлівы.

Занятак 17

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку

## Ц

Кураняты і … (мал. курыца з куранятамі)

П’юць чай на вуліцы.

---

## Адзін – многа

**Назаві дзетак жывёл** (*одно кураня – многа куранят…*)

Мал. уроскідку (дзіцяняты жывёл намаляваны так, што адно заўсёды стаіць трошкі ў баку):

Кошка з кацянятамі

Сабака са шчанятамі

Авечка з ягнятамі

Качка з качанятамі

Гусь з гусянятамі

Свіння з парасятамі

Зайчыха з зайчанятамі

Ліса с лісянятамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Прыдумай мянушку

**Як зваць шчаня?**

Мал. шчаня (чорна-белы)
з выразна выдзеленымі ілбом, шчокамі, бакамі, пузам.

Расфарбуй шчаня. Раскажы, якое яно (*белалобае, кароткахвостае…*)
Прыдумай яму мянушку.
Намалюй побач, што хочаш. Раскажы, што аднойчы адбылося са шчанём.

---

**Чацвёрты лішні**

Паглядзі на малюнкі. Закрэслі той, што не падыходзіць. Растлумач, чаму ён лішні. Расфарбуй астатнія малюнкі.

Мал. шчаня, казляня, кураня, парася

---

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Занятак 18

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку

## Дж

Рана-раненька пчала
Пакідала вулей,
Заспявала-загула,
Каб усе пачулі:

мал да верша

- Джу-джу-джу,
джу-джу-джу,
Я без справы не… (*сяджу*),
Джу-у!

---

Завучы напамяць

Дожджык, дожджык – грыбасей,
Ты для нас грыбы … (*пасей*).
Дожджык, дожджык – рыбачок,
Злаві рыбку на … (кручок).

мал грыбы

Значок “расфарбуй”

**Дамалюй дожджык**

---

## Усё навокал мае назву

**Зайдзі і злучы стрэлкамі малюнкі з аднолькавымі назвамі.**

Мал. уроскідку: носік чайніка, нос чалавека; сумка дамская, кенгуру, у якога на пярэднім плане сумка з кенгуранем; высунуты язык чаловека, чаравік, на пярэднім плане язык; званочак металічны,званочак-кветачка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Раскажы па малюнках

**Паглядзі на малюнкі. Падумай, што адбылося ў пачатку, што было потым. Пранумяруй малюнкі. Раскажы па іх па парадку.**
**Прыдумай, што было далей.**

| | |
|---|---|
| Мал. Сям'я за святочным сталом.<br>Дзіця задувае свечкі на торце. | Сям'я за святочным столом.<br>Усе глядзяць на торт з запаленымі свечкамі. |
| Мама рэжа торт (без свечак)<br>на кавалкі | Ва ўсіх членаў сям'і па кавалку торта на талерках |

Прыдумай назву свайму расказу

______________________________________________

## Чаму так гавораць?

| |
|---|
| Усюды добра, а дома найлепш. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Занятак 19

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку

Ч

Шубка ў авечкі цяплейшая за … (*печку*)

Мал. контур авечкі без «шубы».

Намечаны пару завіткоў.

Дамалюй авечцы шубу

---

## Скажы наадварот

Падбяры словы, процілеглыя па сэнсе (*стары чалавек – малады чалавек, сырое яйка – варанае яйка*… )

| | | |
|---|---|---|
| Мал.стары чалавек | Мал. стары парасон (с дзіркай, пагнуты) | Мал.старая (пакамечаная) газета |
| Мал.малады мужчына | Мал. новы парасон (з біркай) | Мал. свежая газета (на вітрыне кіёска) |
| | | |
| Мал.сырое яйка | Мал.сырая вада (цячэ з крана) | Мал.сырое надво'е (восень, марасіць дождж) |
| Мал.варанае яйка (на падставачцы) | Мал. чайнік, з носіка ідзе пара (кіпіць) | Мал.цёплае надвор'е (лета, сонца) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Што расце на нашей градцы?

**Паслухай верш**

Ад стараннай працы
Выраслі на градцы
Вось такія буракі!
Вось такія агуркі!
А капусты качаны -
Вось такой велічыні!

Мал.: градкі з памідорамі, агуркамі,

Побач у кошыку: бульба, морква, цыбуля, бурак, капуста.

Што расце на градцы? Назаві адным словам.
Абвядзі кружком гародніну, у якой ядуць «вяршкі».
Што ядуць у астатняй гародніны?
Што можна прыгатаваць з агародніны?
Суп з бульбы які? (*бульбяны*) Пюрэ з бульбы якое? Катлеты з бульбы якія?
Як называюцца гэтыя і іншыя стравы з бурака, морквы, цыбулі, капусты, памідораў, агуркоў, гарошку? (*Суп бурачны, …*)

---

**Чаму так гавораць?** **А так?**

| | | |
|---|---|---|
| Кожная хата ў жніўні багата. | | Халодны верасень, але сыты. |

---

**Назаві**

Паглядзі ўважліва на вітрыны і скажы, як называюцца гэтыя магазіны (*абутковы, кнігарня, агародніна*).

Мал. тры магазіны; у вітрыне першага стаіць абутак, у вітрыне другога –кнігі, трэцяга – агародніна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Занятак 20

## Падкажы слоўца і паўтары чыстагаворку

### Дз

Дзі - дзі – дзі – на вуліцу… (*ідзі*) Дзе – дзе – дзе – лодка на (*вадзе*)

Добры маладзец дзьмухнуў на … (мал. дзьмухавец)

Рыжая вавёрка кладзе арэхі ў … (мал. вядзёрца)

## Адгадай загадку

І дзень ішоў, і ноч ішоў,
А з месца нават не сышоў.

Мал. контур гадзінніка без стрэлак

Дамалюй стрэлкі. Якая гадзіна на тваім гадзінніку?

Вывучы загадку напамяць і загадай яе сваім сябрам.

## Вывучы напамяць.

Кухар цэлы дзень клапоча –
Накарміць нас смачна хоча.
Ён, напэўна, на абед
Смажыць тысячу катлет!

Мал. кухар за плітой

Мал. піражкі, сардэлькі, сасіскі, пельмені, варэнікі, яйкі, бутэрброды.

Паглядзі на малюнкі і скажы, што яшчэ гатуе кухар (*многа піражкоў*, *многа сасісак*…).
Якія яшчэ стравы ты ведаеш? Скажы іх са словам «многа».

## Чаму так гавораць?

Якую кашу зварыш, такую і з’ясі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## **Хто гэты ласун?**

Мал.: Карлсан за сталом есць варэнне са слоіка.

На стале сок у шклянцы і піражкі.

Мал. грушы, слівы, яблыкі,

вішні, абрыкосы, персікі,

апельсіны, бананы

Паглядзі на малюнкі. Назаві ўсё гэта адным словам.
Якую яшчэ садавіну ты ведаеш?
Назові садавіну ласкава (*грушка, яблычак*…)
Якое варэнне вараць з гэтай садавіны?(*Грушавае*…)
Які сок робяць? (*Грушавы*…)
Якая начынка ў піражках? (*Грушавая*…)

---

Паслухай верш
**Скорагаворка за абедам**

Супніца,
Смятанніца,
Сухарніца,
Салатніца,

Рыбніца,
Гарчычніца,.
Сурвэтніца,
Гусятніца,

Цукарніца,
Цукерніца,
Сырніца,
Сальніца,

Перачніца,
Масленіца,
Хлебніца,
Вадзіца.

Мал. прадметы столовага посуду

Якое слова ў вершы лішняе? Як назваць усе астатнія прадметы адным словам? Раскажы, што захоўваюць у посудзе, пра які гаворыцца ў скорагаворцы? Які яшчэ ты ведаеш посуд? Паспрабуй вывучыць скорагаворку напамяць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Занятак 21

**Каму што трэба?**

Мал. шахцёр (у робе і касцы з ліхтарыкам), з палітрай і пэндзлем у руцэ; будаўнік у робе, касцы, з кастрюляй і друшлякам у руцэ; мастак (у бабачцы, берэце) з палкай рэгуліроўшчыка ў руках.

Тут намаляваны шахцёр, будаўнік, мастак, рэгуліроўшчык, кухар і музыкант. Ці правільна яны выбралі прадметы, якія спатрэбяцца ім для працы?

Мал. міліцыянер з кельмай і цаглінай у руках, кухар са скрыпкай і смычком, музыкант (у фраку з бабачкай) з адбойным малатком у руках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

**Чацвёрты лішні**

Паглядзі на малюнкі. Закрэслі той, што не падыходзіць. растлумач, чаму ён лішні. Расфарбуй астатнія малюнкі.

Мал. піла, малаток, відэлец, абцугі

---

## Раскажы па малюнках

**Выраж малюнкі, разлажы іх па парадку**

**і раскажы, што адбылося.**

| | |
|---|---|
| прыклей | Мал.: вазок цэлы, у ім сабачка |
| прыклей | Мал.: вазок пусты, без кола |
| прыклей | Мал.: вазок пусты, цэлы |
| прыклей | Мал. вазок перакулены, без кола, побач ляжаць малаток, адвёртка |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Адгадай загадку

Як сагнецца
цвік у крук, мал абцугі
без мяне тут,
як без рук.

Занятак 22

## Паўтары чыстагаворку

Шча – шча – шча – я злавіў …(мал. лешч).
Шчэ – шчэ –шчэ - хачу злавіць …(*яшчэ*).

Рэчка, сажалка рака
Добра знаюць … (Мал. шчупак)

---

## Адгадай:

Ва ўсіх дзетак
адзенне з манетак

Мал. контур рыбы с некалькімі лускаўкамі

Намалюй рыбцы «адзенне».

Чым пакрыта цела рыбы?
Як называюцца дзіцяняты рыб? (*Малькі*)
Дзе жывуць рыбы? Калі рыба жыве ў рацэ, яна якая? (*Рачная.*) А калі ў моры? У возеры? У акварыуме?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

## З чаго складаюцца словы?

Складзі новае слова са складоў назваў намаляваных прадметаў

мал.шары мал. барабан

?

## Успомні казку.

Ілюстрацыя да казкі «Лёгкі хлеб»:

Мужык і воўк ядуць хлеб.

Успомні, што мужык расказваў ваўку. Як жа атрымаць хлеб?

Як называецца мука з пшаніцы? (*Пшанічная.*) З жыта? З кукурузы? З аўса? З ячменя? З бульбы? Як яшчэ называюць бульбяную муку? (*крухмал*)

---

**Адгадай.**

Абвядзі кружком правільны адказ.

Чорны, жытны… Белая, пшанічная…

Мал.: бохан хлеба ватрушка мал.: піражок булачка

Аўсянае, круглае… Ячневая, …

Мал.: абаранак пячэннье талерка з кашай пернік

---

## Чаму так гавораць?

Хлеб будзе, дык усё будзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Чацвёрты лішні

Паглядзі на малюнкі. Закрэслі той, што не падыходзіць. Растлумач, чаму ён лішні. Расфарбуй астатнія малюнкі.

Мал.чаравікі, шкарпэткі, туфлі, боты.

---

Памятаеш чалавека Рассеянага з вуліцы Басейнай з верша С.Я.Маршака? Складзі сказы пра Рассеянага, які выйшаў на прагулку без намаляваных прадметаў (*Рассеяны выйшаў на прагулку без чаравікаў. Рассеяны выйшаў на прагулку без …)*

---

Хутка ў школу!

Памажы Ясіку сабрацца ў школу. Якія рэчы трэба пакласці ў партфель? Злучы іх лініямі з партфелем.

Мал.:Ясік, побач з ім партфель,

затым уроскідку: Буквар, сшытак, ручка, моркаўка, фарбы і пэндзаль, мяч, пенал, аловак, лінейка, лялька-неваляшка.

Якк называюцца рэчы, якія ён склаў?

---

## Чаму так гавораць?

Да чаго не дойдзеш,
Тое ў кнізе знойдзеш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Заданне на вокладку

## Раскажы казку

Мал. да казцы «Пілiпка- сынок»

| | |
|---|---|
| Жонка калыша палена. Побач мужык. | У калысцы ляжыць хлопчык. На яго глядзяць жонка і мужык. |
| Пілiпка ў чоўніку вудзіць рыбу. На беразе маці з абедам. Кліча Пілiпку. З-за кустоў падглядвае баба Яга | Баба Яга на беразе, падманіўшы Пілiпку, цягне яго ў мяшок. Пусты чоўнік на вадзе. |
| Баба Яга, спіць на траўцы. Пілiпка кладзе ў мяшок камяні. | Баба Яга дома вытрушвае з мяшка камяні. На гэта глядзіць яе дачка. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Што было далей?

## Чаму так гавораць?

Не зыч ліха другому, каб не давялося самому.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ